УДК 633.3+633.853«321» : 631.584.5

А. Г. ЯГУПЕНКА, Л. В. КУКРАШ, Г. К. СТАНКЕВІЧ

ЗЕРНЕСУМЕСІ БАБОВЫХ КУЛЬТУР З ЯРАВЫМ РАПСАМ

Галоўным кампанентам канцэнтраваных кармоў у Беларусі з'яўляецца зерне злакавых культур, у кармавой адзінцы якога змяшчаецца не больш за 85 г страўнага пратэіну, што на 20—25 г менш за фізіялагічна абгрунтаваную норму. Найбольш рэальнай крыніцай вырашэння праблемы ўзбагачэння бялком канцэнтраваных кармоў з'яўляецца зерне гароху, вікі яравой, лубіну, кармавых бабоў. У гаспадарках рэспублікі пры вырошчванні гароху і вікі на зерне і насенне атрымалі распаўсюджанне іх сумесі з зерневымі культурамі, што дазваляе атрымаць высокабялковы фураж, збалансаваны па амінакіслотнаму саставу [2—4].

У апошні час шырока высяваецца яравы рапс, у насенні якога змяшчаецца 20—29% сырога бялку [5], што не ўступае па амінакіслотнаму саставу соеваму [1]. У сувязі з гэтым намі ў 1987—1989 гг. вывучалася прадукцыйнасць асноўных зернебабовых культур пры сяўбе іх у сумесі з яравым рапсам.

Даследаванні праводзіліся на доследным полі эксперыментальнай базы «Жодзіна» Смалявіцкага раёна на дзярнова-падзолістай лёгкасуглінкавай глебе з наступнай характарыстыкай ворнага слоя: pH_{KCl} 6,0—6,4, колькасць гумусу — 1,80—1,96%, P_2O_5 — 15,0—24,5, K_2O — 25,0—29,5 мг/100 г глебы. Папярэднік — азімыя культуры, доза ўгнаенняў — $N_{30}P_{60}K_{90}$. Вывучаліся парныя сумесі кармавога гароху Усцянскі, кармавых бабоў Аушра, яравой вікі Белацаркоўская 222, вузкалісцевага лубіну Ціміразеўскі 1 з яравым рапсам Кубанскі пры розных нормах высявання насення. Доследы закладваліся ў чатырохразовай паўторнасці пры заліковай плошчы дзялянкі 25 м^2.

Найбольш ураджайнай культурай пры сяўбе ў чыстым выглядзе ў сярэднім за тры гады вывучэння былі кармавыя бабы — 40,7 ц/га, затым лубін вузкалісцевы, гарох і віка яравая (табл. 1). Па збору бялку кармавыя бабы і лубін раўнацэнныя паміж сабой і пераўзыходзяць па гэтым паказчыку віку і гарох. Яравы рапс уступаў усім вывучаемым культурам як па ўраджайнасці зерня, так і па бялковай прадукцыйнасці.

Змешаныя пасевы гароху і вікі з рапсам больш прадукцыйныя за аднавідавыя пасевы гэтых культур. Лепшымі гарохарапсавымі зернясумесямі па ўраджайнасці і выхадзе бялку з 1 га былі пасевы з нормамі высявання гароху 1,05—0,75 і рапсу — 0,9—1,5 млн шт. усходжага насення на 1 га. Прадукцыйнасць кармавых бабоў у змешаных пасевах з яравым рапсам ніжэйшая, чым пры сяўбе іх у чыстым выглядзе. У сярэднім за тры гады лепшымі па выхадзе насення вікі і збору бялку з гектара былі зернясумесі, якія вырашчаны пры нормах высявання вікі 1,75—1,25 і рапсу 0,9—1,5 млн шт. усходжага насення на 1 га. Удзельная вага вікі ў гэтых зернясумесях ва ўсе гады даследаванняў была высокая — 74,7—82,0%. Змешаныя пасевы вузкалісцевага лубіну з яравым рапсам знікаюць прадукцыйнасць у параўнанні з чыстым пасевам лубіну. Так, у сярэднім за тры гады ўраджайнасць лубіну ў аднолькавым пасеве склала 38,0, ураджайнасць сумесей — 30,0—28,1 ц/га.

Ва ўсіх вывучаемых культурах не выяўлена заканамернасці ў зменах паказчыка палявой усходжасці насення ў залежнасці ад спосабу сяўбы і нормаў высявання (табл. 2).

Захаванасць раслін да ўборкі ў змешаных пасевах вышэйшая, чым у чыстых, і павялічваецца пры памяншэнні нормы іх высявання ў сумесі. У кармавых бабоў пры норме іх высявання 0,28, 0,24 і рапсу — адпавед-

Табліца 1. **Змяненні паказчыкаў палявой усходжасці насення ў залежнасці ад сяўбы (сярэдняе за 1987—1989 гг.)**

Варыянт (норма высеву, млн шт. усходжага насення на 1 га)	Ураджайнасць (усяго), ц/га	У тым ліку			Выхад бялку, ц/га
		бабовага кампаненту		рапсу, ц/га	
		%	ц/га		
Гарох					
1,5	29,7	100	29,7	—	6,44
1,05+рапс 0,9	33,1	76,5	25,3	7,8	7,20
0,9+тое ж 1,2	34,3	71,9	25,3	9,0	7,53
0,75 » 1,5	32,8	68,4	22,9	9,9	7,19
0,60 » 1,8	32,4	61,8	20,2	12,2	7,11
0,45 » 2,1	30,7	55,8	17,1	13,6	6,72
Кармавыя бабы					
0,4	40,7	100	40,7	—	10,50
0,28+рапс 0,9	36,6	58,8	22,1	14,5	9,0
0,24 тое ж 1,2	33,0	53,9	18,9	14,1	8,06
0,20 » 1,5	30,8	50,9	16,0	14,8	7,45
0,16 » 1,8	30,6	48,2	15,1	15,5	7,40
0,12 » 2,1	29,9	42,8	13,0	16,9	7,16
Віка яравая					
2,5	29,6	100	29,6	—	7,40
1,75+рапс 0,9	33,6	82,0	27,5	6,1	8,28
1,50+тое ж 1,2	34,2	78,0	26,6	7,6	8,42
1,25 » 1,5	34,4	74,7	25,6	8,8	8,45
1,0 » 1,8	33,4	67,7	22,5	10,9	8,11
0,75 » 2,1	32,5	64,7	20,9	11,6	7,84
Лубін вузкалісцевы					
1,2	38,0	100	38,0	—	10,78
0,84+рапс 0,9	29,1	52,5	15,0	14,1	7,36
0,72 тое ж 1,2	30,0	32,3	12,9	17,1	7,50
0,60 » 1,5	29,1	35,6	10,2	18,9	7,13
0,48 » 1,8	28,3	28,2	8,1	20,2	6,82
0,36 » 2,1	28,1	24,3	6,9	21,2	6,72
Рапс яравы					
3,0	23,7	—	—	23,7	5,37
$НІР_{05}$, ц/га	2,7—2,8				